# Пятая сесія Вярхоўнага Савета СССР

# Прамова дэпутата Ц. Я. Кісялёва

**(Баранавіцкая выбарчая акруга, Беларуская ССР)**

Таварышы дэпутаты! З неаслабнай увагай, з пачуццём высокага гонару за нашу сацыялістычную Радзіму выслухалі мы даклад кіраўніка нашага Урада Мікіты Сяргеевіча Хрушчова. У гэтым дакладзе намалявана яркая карціна выдатных дасягненняў Савецкай краіны, якія даюць магчымасць распачаць ажыццяўленне новых буйных мер, накіраваных на далейшы ўздым дабрабыту ўсяго савецкага народа. У нашай краіне ўсё робіцца для шчасця чалавека. У гэтым Камуністычная партыя Савецкага Саюза бачыць сваю галоўную задачу.

У дакладзе таварыша М. С. Хрушчова выкладзена прапанова Урада аб адмене падаходнага падатку з заработнай платы рабочых і служачых. Гэтая прапанова вынікае з рашэнняў XXI з'езда КПСС. Адмена падаходнага падатку — найвялікшы па свайму палітычнаму і эканамічнаму значэнню акт Савецкай дзяржавы. Такое мерапрыемства праводзіцца ўпершыню ў гісторыі дзяржаў. Яно магчыма толькі ва ўмовах сацыялістычнага ладу.

Вялікае народнагаспадарчае значэнне мае таксама прапанова Урада аб змяненні маштабу цэн, узбуйненні грашовай адзінкі і замене грошай, якія цяпер абарачаюцца, новымі грашыма. Далейшае ўдасканальванне савецкай грашовай сістэмы — у інтарэсах і дзяржавы, і народа. Правядзенне гэтага важнага мерапрыемства будзе садзейнічаць далейшаму людзей факта, што ўпершыню ў сусветнай гісторыі краіна, якая мае самую магутную зброю, прапануе забараніць яе і ажыццявіць усеагульнае і поўнае раззбраенне. Чалавечы розум, воля народаў падказваюць неабходнасць прыняцця савецкіх прапаноў усімі дзяржавамі.

Праз некалькі дзён спаўняецца пятнаццаціголдзе з дня разгрому гітлераўскай Германіі. Прайшоў вялікі тэрмін, але мірны дагавор з Германіяй да гэтага часу не падпісан. Мы лічым такое становішча зусім ненармальным. Час, нарэшце, ліквідаваць небяспечны ачаг напружанасці ў цэнтры Еўропы.

Урад Адэнауэра стаў на небяспечны і згубны шлях. Як відаць з апошніх выступленняў Адэнауэра, ён не ўяўляе сабе іншай абстаноўкі ў свеце, апрача «халоднай вайны». Наступіўшае пацяпленне ў міжнародных справах кідае яго ў дрыжыкі. Ён нават падумвае аб пераглядзе існуючых граніц паміж дзяржавамі. Але, пан канцлер, хоць Вы і занадта стары чалавек, але ўсё роўна павінны адчуваць, што палітычнае надвор'е робіць сёння не халодны вецер з Бона. Бонскія рэваншысты падумваюць у першую чаргу паглынуць Германскую Дэмакратычную Рэспубліку, ліквідаваць сацыялістычныя заваёвы двайную ігру. З аднаго боку хочуць заспакоіць грамадскую думку ў сваіх краінах і заяўляюць аб сваёй згодзе на перагаворы. А з другога—працягваюць гонку ўзбраенняў; накопліваюць атамную зброю, ствараюць аб'яднаныя сілы НАТО, заахвочваюць германскі рэваншызм. Прадстаўнікі заходніх дзяржаў выдумваюць усё новыя і новыя цяжкасці, каб не дапусціць падпісання пагаднення аб спыненні выпрабаванняў ядзернай зброі. Асабліва ярка пазіцыя заходніх дзяржаў выявілася на пасяджэннях Камітэта па раззбраенню ў Жэневе. Яны яўна не хочуць раззбройвацца і маюць намер зноў утапіць пытанне аб раззбраенні ў размовах.

Відаць, пэўныя колы на Захадзе разлічваюць і ў далейшым ігнараваць волю народаў. Аднак гэта—блізарукія разлікі. Народы ўжо даўно перасталі быць паслухмянай зброяй у руках імперыялістычных палітыкаў, яны ўсё гучней заяўляюць аб сваёй волі, усё больш актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці, усё больш настойліва прад'яўляюць свае патрабаванні да ўрадаў. У свядомасці народаў Злучаных Штатаў Амерыкі, Францыі і іншых капіталістычных краін адбываюцца велізарныя зрухі. Пасля трыумфальных паездак Мікіты Сяргеевіча Хрушчова па гэтых краінах падпальшчыкам вайны ўсё цяжэй ашукваць іх насельніцтва байкамі аб «савецкай па-

два разы больш і малака на 37 працэнтаў больш, чым за той жа перыяд 1959 года. Цяпер у рэспубліцы поўным ходам ідуць веснавыя палявыя работы. Працаўнікі калгасаў і саўгасаў прыводзяць у дзеянне раней нявыкарыстаныя рэзервы для павелічэння вытворчасці ўсіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі і выканання прынятых сацыялістычных абавязацельстваў.

Расцвітае жыццё ў гарадах і сёлах рэспублікі. Гэты росквіт—вынік самаадданай працы беларускага народа, вынік неасправчных пераваг сацыялістычнага ладу, вынік ажыццяўлення нашай партыяй вялікіх запаветаў У. І. Леніна.

У адказ на новае праяўленне бацькоўскіх клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб няспынным росце дабрабыту савецкага народа працоўныя Беларусі яшчэ шырэй разгорнуць сацыялістычнае спаборніцтва, забяспечаць датэрміновае выкананне сямігодкі і тым самым унясуць свой уклад у агульнанародную справу барацьбы за мір, за камунізм. **(Апладысменты).**

